ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 89 (1056) | ЧАЦЬВЕР, 17-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

Бязьлітасна змагацца з правай, як галоўнай небясьпекай, не паслабляючы барацьбы з „левымі“ загібамі

Бальшавіцкай самакрытыкай выкрыць і зьнішчыць прарывы

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

(Ад 10-га красавіка 1930 году)

Заслухаўшы паведамленьне тав. ...жова аб становішчы ў Магілеўскай партыйнай організацыі, Бюро КП(б)Б констатуе, што Магілеўскі акругком у кіраўніцтве работай па колектывізацыі дапусьціў рад палітычных памылак, вынесшы рад няправільных пастаноў па пытаньні аб колектывізацыі, якія не выходзяцца з лініяй партыі.

Не гледзячы на ясную, выразную ўстаноўку партыі па пытаньні аб ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнае колектывізацыі, ...дзеньскі пленум Магілеўскага акругкому ўхваліў пастанову аб ліквідацыі кулацтва і новай буржуазіі, як клясы, сказіўшы, такім чынам, асноўны лёзунг партыі і паказаўшы гэтай пастановай неразуменьне таго, што „трэба бачыць розьніцу паміж нэпманамі, ...я даўно ўжо пазбаўлены ў асноўным вытворчай базы і ня маюць таму колькі-небудзь сур'ёзнай вагі ў нашым гаспадарчым жыцьці, і паміж кулакамі, якія да апошняга часу мелі вялізарную гаспадарчую вагу на вёсцы і якіх мы толькі зараз пазбаўляем іх вытворчай базы“ („Запытаньні сьвярдлоўцаў і адказы т. Сталіна“).

Насуперак выразнай установцы партыі аб прадстаўленьні беднякам і серадняком, якія не ўвайшлі ў колгасы, зямлі па фактычным землякарыстаньні, Магілеўскі акругком даў няправільную установку аб зьніжэньні нормы фактычнага землякарыстаньня на 25 проц.

У той час, як у практыцы работы па колгасным будаўніцтве былі дапушчаны на мясцох грубейшыя памылкі, перагібы і скажэньні партыйнай лініі, акругком своечасова не рэагаваў на гэта, паказаўшы нерашучасьць і ня здолеўшы хутка мобілізаваць партыйную організацыю на рашучую барацьбу са скажэньнямі партыйнай лініі на выпраўленьне памылак.

Антыбальшавіцкія, правопортуністычная пастановы Шклоўскага райкому партыі, няправільныя пастановы партсходаў Чэрыкаўскага і Крычаўскага раёнаў, невыстарчальна рашучы і своечасовы адпор правоопортуністычным элемэнтам і „левым“ загібшчыкам, марудлівасьць і несвоечасовая мобілізацыя ўсёй Магілеўскай парторганізацыі на барацьбу з элемэнтамі, якія супраціўляюцца правядзеньню лініі партыі, сьведчаць аб тым, што бюро акругкому ня здолела своечасна і рашуча паставіць пытаньне аб выпраўленьні памылак і ліквідацыі скажэньняў партыйнай лініі ў колгасным будаўніцтве. У выніку гэтага, а таксама пры наяўнасьці агульнай слабасьці масавай політычнай работы сярод батрацтва і беднаты, у Магілеўскай акрузе меў месца вялікі адлів з колгасаў (з 20-га сакавіка па ... красавіка процант колектывізаванай засеўнай плошчы зьнізіўся з 76,5 проц. да 20,1 проц., а процант колектывізаваных двароў—з ... проц. да 19,2 проц).

Выходзячы з гэтага, у дадатак да тых організацыйных мерапрыемстваў, якія праведзены ўжо Бюро ЦК (адкліканьне т. Нэйланда, роспуск Шклоўскага райкому) і прынятых ужо пастаноў акругкому (зьняцьце члена бюро АК т. Дадава, роспуск бюро Чэрыкаўскага РК і зьняцьце сэкратара РК т. ...дзілава) Бюро ЦК лічыць патрэбным тэрмінова правесьці і ставіць перад Магілеўскай парторганізацыяй наступныя задачы:

1. Зараз-жа правесьці рад мерапрыемстваў па ўзмацненьню партыйнага кіраўніцтва Магілеўскай парторганізацыі. Даручыць оргінструктарскаму аддзелу ЦК у 3-х дзённы тэрмін накіраваць для партыйнай работы ў Магілеўскую акругу групу кіраўнічых партработнікаў.

2. Кіруючыся пастановай сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, паставіць перад акругкомамі і ўсёй партыйнай організацыяй, як адну з самых баявых і важнейшых задач, мобілізацыю ўсяе партыйнае організацыі на рашучае выпраўленьне памылак і ліквідацыю скажэньняў партыйнай лініі ў колгасным будаўніцтве. Трэба даць бязьлітасны адпор усім тым элемэнтам, якія яшчэ да гэтага часу ўпарта аказваюць актыўнае і пасыўнае супраціўленьне правядзеньню лініі партыі, рашуча выкрываць правых опортуністых і „левых“ загібшчыкаў, даючы рашучы адпор усялякім опортуністычным тэорыям аб „адступленьні“. Разгарнуўшы ва ўсёй парторганізацыі глыбокую прапрацоўку артыкулаў т. Сталіна і дырэктыў партыі, акругкому праводзіць курс на рашучую зьмену ўсіх тых комуністых, якія ня здольны і не праяўляюць бальшавіцкай мужнасьці ў справе выпраўленьня памылак і скажэньняў і праводзіць правільную лінію партыі.

3. Цэнтр увагі згуртаваць на разгортваньні масавай работы сярод батрацка-бядняцкіх мас, энэргічна ўзяцца за організацыю батрацка-бядняцкіх груп у колгасах, правесьці самае шырокае растлумачэньне пастаноў ЦК УсеКП(б), артыкулу т. Сталіна „Адказы таварышом колгасьнікам“ і пастанову сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б як сярод колгасьнікаў, так і сярод усёй бядняцка-серадняцкай масы вёскі.

4. Концэнтруючы ўсе сілы і ўвагу парторганізацыі на пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы, акругкому, райкомам і ўсёй парторганізацыі самым энэргічным чынам праводзіць у жыцьцё дырэктывы ЦК, накіраваныя ў бок організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў: узмацненьне кіруючых колгасных кадраў, правільны догляд і ўтрыманьне абагуленай жывелы, організацыя працы, організацыя адыходных промыслаў колгасьнікаў, уздым працоўнай дысцыпліны і г. д., рашуча дабіваючыся таго, каб шляхам правільнага вядзеньня колгаснай гаспадаркі і ўнутранага ўзмацненьня колгасаў апошнія зьяўляліся сапраўдным прыкладам для навакольнага бядняцка-серадняцкага сялянства, зьяўляліся стымулам да далейшага ўзмацненьня колгаснага руху.

5. Акругкому, райкомам і ўсёй парторганізацыі самую сур'ёзную ўвагу зьвярнуць на пытаньне правядзеньня веснавой сяўбы індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Бюро ЦК прапануе зараз-жа праверыць давядзеньне заданьняў па сяўбе да асобнага двара, організаваць дапамогу з боку колгасаў і саўгасаў, якія скончылі сваю сяўбу, маламоцным індывідуальным гаспадаркам шырока растлумачыць сярод індывідуальнікаў пункты закону аб с-г. падатку наконт вызваленьня ад падатку павялічаных супроць мінулага году плошчаў засеву і ўсе іншыя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць поўны засеў яравога кліну і пашырэньне засеўнай плошчы, дабіваючыся ўсьведамленьня ўсёй парторганізацыяй таго, што ў БССР, пры наяўнасьці большасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў колгасы, выкананьне пляну сяўбы індывідуальнікамі зьяўляецца важнейшай задачай на бліжэйшы пэрыод.

6. Перавыбары парторганаў і справаздачную кампанію праводзіць пад пунктам далейшай мобілізацыі ўсёй партыйнай організацыі навакол асноўных задач колгаснага будаўніцтва і правядзеньня веснавой сяўбы пад пунктам сьмелага бальшавіцкага выкрываньня памылак і скажэньняў лініі партыі, скарыстаўшы перавыбары ў максымальнай меры ў мэтах рашучага ўзмацненьня ўсіх кіруючых органаў Магілеўскай парторганізацыі.

Пасьля веснавой сяўбы заслухаць паведамленьне Магілеўскага АК аб выкананьні дырэктыў ЦК і праведзеных Магілеўскім акругкомам мерапрыемствах па ўзмацненьню колгаснага будаўніцтва.

Агляд клясавых сіл у Бэрліне



2-га красавіка бэрлінскі пролетарыят дэманстраваў у Люстгарцэне супроць фашысцкага блёку, соцыял-фашыстаў, пралажыўшых шлях новаму рэакцыйнаму ўраду.

Дзесяткі тысяч дэмонстрантаў нядвухсэнсоўна дэмонстравалі сваю гатоўнасьць працягваць барацьбу да нізрынуцьця панаваньня буржуазіі.

На здымку: Выступленьне тав. Нэймана ў Люстгарцэне.

Масавыя арышты ў Гамбурзе

Сутычкі рабочых з поліцыяй

БЭРЛІН, 15. У Гамбурзе адбыўся сход камітэту барацьбы з забаронай чырвонага саюзу франтавікоў. На сход напала поліцыя. Арыштавана 287 чалавек, у тым ліку 22 жанчыны. У часе ўвозу арыштаваных за іх уступіліся рабочыя, наладзіўшыя дэмонстрацыю солідарнасьці. Адначасова ў Гамбурзе поліцыя напала на фашысцкі сход, на якім было арыштавана 168 чалавек. У Магдэнбурзе адбылася сутычка між сходам беспрацоўных і поліцыяй, якая імкнулася разагнаць сход. Двое беспрацоўных арыштавана. Некалькі паранена.

Сутычкі індусаў з поліцыяй

ЛЁНДАН, 15. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе: У Калькуце адбыліся сур'ёзныя тутычкі індусаў з поліцыяй. Ранена 19 чал., якія паложаны ў шпіталі. Рух трамваяў у Калькуце адбываецца нормальна, але ў суправаджэньня членаў поліцыі. Дзень жалобы, устаноўлены нацыянальным конгрэсам па выпадку арышту старшыні конгрэсу Неру, строга захоўваўся амаль ва ўсіх індускіх кварталах гораду.

На вуліцах гораду пабудаваны загараджэньні, якія перашкаджаюць трамвайнаму руху. Некаторыя трамвайныя вагоны былі падпалены. Поліцыя патрулюе па гораду ў броніраваных аўтамабілях. Становішча ў горадзе надзвычайна напруджанае.

Савецкая ўлада ў Фуцьзянскай провінцыі

У раёнах, занятых чырвонымі атрадамі дзяржаўныя і прыватныя школы пératвораны ў школы ленінізму

ШАНХАЙ, 15. Газэта „Чайна Морнінг Пост“, якая выходзіць у Гунжэнгу, зазначае, што «няўстойлівае дагэтуль палітычнае становішча провінцыі Фуцьзян дае магчымасьць комуністым узмацняць сваю дзейнасьць і замацоўваць свае позіцыі». Па словах газэты, комуністыя ўтварылі савецкі ўрад, улада якога распаўсюджваецца на раёны шэрагу гарадоў заходняй часткі Фуцьзянскай провінцыі.

Савецкі ўрад рэорганізаваў свае войскі і сформіраваў тры палкі. Газэта паведамляе, што ва ўсіх раёнах, занятых чырвонымі атрадамі, дзяржаўныя і прыватныя школы ператорваны ў школы Ленінізму, у якіх выкладаюцца асновы комуністычнага вучэньня.

Напярэдадні 1-га Мая

ПАД СЬЦЯГАМ КОМУНІСТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ СУСЬВЕТНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ МОБІЛІЗУЕЦЦА ДЛЯ РАШАЮЧЫХ БОЕК З КАПІТАЛАМ

Бэрлінскія цэргібелі забараняюць удзел у комуністычных дэмонстрацыях.—У Варшаве утвараюцца арышты за падрыхтоўку да 1-га мая.—Чэхаславацкія рабочыя будуюць трактар для падарунку СССР

Нямеччына

Рабочыя выйдуць на вуліцу пад кіраўніцтвам компартыі і з яе лёзунгамі

БЭРЛІН, 15-4. Ужо некалькі месяцаў таму назад Бэрлінская організацыя компартыі пачала компанію па організацыі першамайскай дэмонстрацыі на самым вялікім пляцу Бэрліну—Люстгартэне.

Бэрлінская організацыя соцыял-дэмократычнай партыі абвясьціла, што яна таксама чакае дэмонстрацыі ў Люстгартэне. Бэрлінскі поліцэйпрэзыдэнт Царгібель ужо забараніў удзел у комуністычнай дэмонстрацыі. У соцыял-дэмократычнай організацыі оркестры дазволены.

„Ротэ Фанэ“ заяўляе, што бэрлінскія рабочыя выйдуць на вуліцу пад кіраўніцтвам компартыі і з яе лёзунгамі.

Францыя

Пад знакам рэволюцыянізаваньня рабочых мас

ПАРЫЖ, 14. Падрыхтоўка да 1-га мая, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам компартыі ... унітарных профсаюзаў, праходзіць пад знакам павышанай рэволюцыйнай актыўнасьці рабочых мас. На мітынгу соцыялістых у вугольным басэйне дэпартаманту Па-дэ-Кале прышло ня больш 300 чалавек.

У організаванай компартыяй контрдэмонстрацыі ўдзельнічала звыш 3000 гарнякоў. Рабочыя выкрыкамі «Няхай жывуць саветы», „Далоў соцыял-фашыстых“ занялі будынак біржы працы.

Польшча

ВАРШАВА, 15. Газэты паведамляюць аб арыштах у Кракаўскім ваяводзтве ў сувязі з падрыхтоўкай да 1-га мая. Арыштавана 17 чалавек па абвінавачваньню ў комуністычнай дзейнасьці.

П. А. З. Ш.

НЬЮ-ЁРК, 16-4. Як паведамляе „Дэйлі Уоркер“ на конфэрэнцыі адзінага фронту Чыкаго прысутнічала 146 дэлегатаў, якія прадстаўляюць 87 рабочых організацый. Конфэрэнцыя пастанавіла прыняць удзел у дэмонстрацыях і забастоўках 1-га мая. Падобныя-ж конфэрэнцыі адбыліся ў Юнгстаўне і іншых прамысловых цэнтрах.

Першамайскі падарунак для СССР

ПРАГА, 12. У сувязі з набліжэньнем 1 мая чырвоныя профсаюзы і компартыя Чэха-Славакіі ўзмацнілі збор ахвяраваньняў на трактар для СССР. Да сучаснага моманту сабрана звыш 30 тысяч чэскіх крон. Трактар будзе перададзены па прызначэньню асобай дэлегацыі ад чэха-славацкіх рабочых, якая прыедзе ў СССР к 1 мая.

Поліцыя разагнала дэмонстрацыю піонэраў

НЬЮ-ЁРК-АМЭРЫКА, 13. У Чыкаго адбылася дэмонстрацыя 30 піонэраў, якія протэставалі супроць імкненьняў улады забараніць організацыю юных піонэраў. Поліцыя разагнала дэмонстрантаў і арыштавала 15 піонэраў.

Гэраічная барацьба дрэваапрацоўшчыкаў

БЭРЛІН, 13. Забастоўка дрэваапрацоўшчыкаў у Бадэне (Швэйцарыя) працягваецца 7-мы тыдзень. Да забастоўкі далучыліся каменшчыкі і нядаўна прыбыўшыя з Бадэну беспрацоўныя будаўнікі, знайшоўшыя работу ў Базэлі.

10.000 рабочых удзельнічала ў мітынгах бастуючых будаўнікоў у Францыі

ПАРЫЖ, 15-IV. Да бастуючых парыскіх будаўнікоў далучыліся новыя групы рабочых, узьняўшы на пакінутых пабудовах чырвоныя сьцягі. У наладжаных бастуючымі мітынгах удзельнічала 10.000 рабочых. У стачачны фонд прысылаюцца адлічэньні рабочых розных профэсій.

Ул. Маякоўскі

Поэта рэволюцыі

Памёр—сьмерцю нечаканай і бясэнснай—вялікі рэволюцыйны поэта Уладзімер Маякоўскі.

Зусім нядаўна савецкая грамадзкасьць адзначала дваццацігодзьдзе яго літаратурнай і політычнай дзейнасьці. Злучэньне гэтых слоў дакладна паказвае Маякоўскага і яго творчасьць. Уся яго літаратурная работа была аддана на службу рэволюцыі.

У апошнім сваім прадсьмертным вершы Маякоўскі—як-бы падводзячы вынікі 20 гадовай рабоце—пісаў:

„Я подыму,
Как большевистский партбилет,
Все сто томов
Моих
Партийных книжек!“

Усе гэтыя кніжкі—аб рэволюцыі, аб барацьбе, аб бу аўніцтве.

У гады жорсткай ваеннай рэакцыі і шовіністычнага разгулу Маякоўскі—сярод тых нямногіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія выступаюць супроць вайны.

У рэволюцыю 1917 году ён супроць часовага ўраду, супроць „коаліцыі і абароны“.

З першых-жа дзён Кастрычніка ён, разьбіваючы хвалю сабатажу, абвяшчае сябе прыхільнікам савецкай улады і цалкам аддае свой талент на службу рэволюцыі, узвальваючы на сябе самую патрэбную чарнавую работу.

Грамадзянская вайна. Усе сілы кінуты на франты. Маякоўскі—у РОСТ'е—дзень за днём вядзе масавую агітацыю, паказваючы ў чоткіх, кароткіх і ўдарных як эпоха, як ваенныя загады, лёзунгах вялізарную работу па стварэньню Чырвонай Арміі.

Ваенныя франты ўступаюць месца гаспадарчым, уводзіцца НЭП, партыя гаворыць: Вучэцеся гандляваць, рэспубліка чысьціцца ад франтавога бруду...

Маякоўскі піша „рэклямныя“ вершы для Мосьсельпрому, плякаты супроць вошай, і за чыстыя тротуары, за гатаваную ваду. Гэта вялізарнейшая ўвага да дробязяй, да чарнавой работы, гэтае ўпартае жаданьне паставіць сваё маштабы на службу практычным інтарэсам клясы праходзіць праз усю творчасьць поэты. Маякоўскі органічна адчуваў савецкую дзяржаву сваей і па гэтаму цікавіўся кожнаю дробязьзю, глядзеў на ўсё ня толькі зіркім вокам поэты, але і рашучым поглядам гаспадара.

Аднак, „дробязі“ не засланілі галоўнага. Будаўніцтва дамоў і фабрык, не засланілі політычнай барацьбы і клясаў.

Абвостраньне клясавай барацьбы ў краіне, вялізарнейшыя задачы рэконструкцыйнага пэрыоду засталі непадрыхтаванымі многіх пісьменьнікаў і поэтаў.

Маякоўскі—адзін з першых і празарлівей усіх—бачыць гэтыя глыбокія зрухі. Яго вершы 1928-29 году прысьвечаны барацьбе з клясавым ворагам, кулаком і нэпманам, хлебазагатоўкам, социялістычнай рэконструкцыі. Ён належаў да тых нямногіх, якія налічваюцца ў нас адзінкамі поэтаў, якія заўсёды ішлі ў ногу з рэволюцыяй і ўсьведамлялі яе гіганцкія маштабы.

Для Маякоўскага ніколі не стаяла пытаньне—„прымае ён рэволюцыю, альбо „ня прымае“. Адзіным пытаньнем, якое яго цікавіла, было—як служыць рэволюцыі. З поўным правам ён гаварыў аб сабе:

„Делами
Кровью
Строкою вот этою,
Нигде
Не бывший в найме,—
Я славлю
Взвитое красной ракетою
Октябрьское
Руганое
И пропетое
Пробитое пулями знамя“.

Гэты сьцяг—быў яго сьцягам. Ён не наглядаў рэволюцыю з „прыгожага далёку“, а ўдзельнічаў у барацьбе, чарнавой рабоце. Рэволюцыя не маляваласся Маякоўскаму—„прыгожай незнаёмкай“. Ён быў адным з байцоў на фронце, адным з муляраў на будоўлі.



Ул. Маякоўскі.

Лепш, чым хто-небудзь іншы з прышоўшых да нас прадстаўнікоў інтэлігенцыі, Маякоўскі разумеў, што рэволюцыя—гэта рабочая кляса і яе комуністычная партыя.

З 16 год дапамагаючы практычай рабоце партыі, ён папаў на лаву падсудных, а адтуль у турму. Усім вядома, што, ня будучы членам партыі, ён разглядаў усю сваю літаратурную дзейнасьць, як дапамогу партыі ў яе вялізарнай рабоце. Ня так даўно на адным з сходаў ён кінуў выразную рэпліку: „Маё пяро я аддаў на службу, на ўслужэньне бальшавіцкай партыі і савецкаму ўраду“.

Цяжкасьці—непазьбежныя ў нашай барацьбе—ня выклікалі ў яго хістаньняў.

У апошнія гады ён блізка падышоў да комсамолу, актыўна працаваў у „Комсомольской Правде“, шмат выступаў на рабочых сходах ня толькі як чытальнік сваіх твораў, але і як політычны работнік, як абаронца генэральнай лініі партыі. Усяго некалькі тыдняў назад ён уступіў у РАПП.

Мы асуджаем самагубства Маякоўскага, як усякі ўход з рэвалюцыйнага паста.

Але бяссэнсная сьмерць яго да таго ня вяжацца з усім яго жыцьцём, так не мотывавана ўсёй яго творчасьцю—да апошняга. учора напісанага радка, што адчуваецца ўсімі ня толькі як трагічная памылка, але і як катастрофа, прычыны якое трэба шукаць у толькі што перанесенай цяжкай хваробе.

Маякоўскі—поэта, футурысты, „лефавец“—прышоў у рэволюцыю сваімі асобнымі шляхамі, але ён ішоў у рэволюцыю нашым агульным шляхам.

Творчасьць Маякоўскага мела вялізарнае значэньне для нас—яго сучасьнікаў. Вялік—і яшчэ дакладна ня вызначан—яго ўплыў на нашых пролетарскіх поэтаў і на ўсю сусьветную пролетарскую літаратуру.

Памёр вялікі рэволюцыйны поэта, памёр майстар пісьменьніцкага цэху, нястомны муляр соцыялістычнай будоўлі.

Яго жыцьцё, яго літаратурная дзейнасьць былі прысьвечаны выкананьню гэтай цяжкай задачы, бальшавіцкаму „перападсталяваньню“ нашай плянэты. Яго кнігі—„все 100 томов моих партийных книжек“—яшчэ паслужаць пролетарыяту і комуністычнай партыі ў той барацьбе, якую мы вядзем.

І хай помнікам яму будзе „построенный в боях социализм“. („Правда“)

Перадсьмяротны ліст Маякоўскага

УСІМ

У тым, што ўміраю, ня вініце нікога і, калі ласка, бяз плётак. Нябожчык гэтага ня любіў.

Мама, сястра і таварышы, выбачце! Гэта ня спосаб (другім ня раю), але ў мяне выхадаў няма.

Ліля, любі мяне.

Таварыш урад! Мая сям'я—гэта Ліля Брык, мама, сястра і Вэрачіка Вітольдаўна Палонская.

Калі ты ўстроіш ім зноснае жыцьцё—дзякуй.

Пачатыя вершы аддайце Брыкам, яны разьбяруцца.

«Как говорят—
«инцидент исперчен»,
любовная лодка
разьбилась о быт.
Я с жизнью в расчете,
и не к чему перечень
взаимных болей,
бед
и обид“.

Шчасьліва заставацца.

Уладзімер Маякоўскі.

12 красавіка 1930 г.

Тав. ВАПП'аўцы! Ня лічэце маладушным.

Сур'ёзна—нічога ня зробіш.

Прывітаньне.

Ермілаву скажэце, што шкада—зьняў лёзунг, трэ' было-б дасварыцца.

У. М.

У стале ў мяне 2.000 руб. Унясіце іх у падатак. Рэшту атрымаеце ў дзяржвыдаце.

У. М.

Супроць антымарксысцкіх крыклівых ацэнак

З лініі агня пролетарскай літаратуры вышоў лепшы салдат, вялікі поэта нашае эпохі—Уладзімер Маякоўскі. Для нас, для ўсяе рабочае клясы, для партыі і комсамолу Маякоўскі быў баявы таварыш па акопах клясавага фронту. Маякоўскі біў па ворагу сьмяротным агнём сатыры, ён рубіў ворага сталёвай шабляй сібернай клясавай нянавісьці.

Як ніводзін поэта нашага часу, Маякоўскі здолеў з усёй сілай свайго тэмпэраманту, з усёй шырынёю і глыбінёю поэты Кастрычніка, ваяваць з кулаком, нэпманам, шовіністым, мешчанінам і падхалімам ва ўсякіх выглядах і масках. Мы ня можам апраўдаць яго сьмерці, як усякага адыходу ад рэволюцыйнай барацьбы, але гэтая агідная і бясэнсоўная сьмерць чалавека Маякоўскага ніколі не зацямніць перад намі гіганцкай фігуры поэты-рэволюцыянэра—пісьменьніка Маякоўскага.

Толькі так можна аднесьціся да сьмерці Маякоўскага. Горш усяго ў такіх выпадках антымарксысцкае і якраз варожае пролетарыяту ацэнка творчасьці поэты. Нам здаецца, што іменна так робіць газэта „Рабочий“, калі ў нумары 88, ад 15 красавіка друкуе наступныя радкі з поваду сьмерці Маякоўскага:

„После революции Маяковский—попутчик (?). Он пишет ряд вещей, проникнутых большим пафосом—„150.000.000“, «Стихи о революции“, „Левый марш“, „Ленин“, п'еса-сатира „Клоп“, „Теодор Нетето“ и др. В этих революционных вещах Маяковский публицист, поэт стихотворного лозунга, но он неизменно выпячивает свое „я“. Это столь характерно для пережитков мелкого буржуа. **И после революции Маяковскому чуждо мироощущение пролетариата, как органическая система идей, чувств и настроений“.**

Прыводзячы гэтую вытрымку з газэты „Рабочий“, мы ніяк ня можам прайсьці міма тэй памылковай і ня менш крыклівай ацэнкі, якую дала газэта „Зьвязда“ Маякоўскаму ў нумары ад 15-4. „Зьвязда“ пісала:

«Бяскрайны індывідуалісты, поэта-арыгінал, анархісты пачуцьцяў і настрояў застаўся верным сабе і ў апошнюю хвіліну. „У мяне выхаду няма“—у гэтых некалькіх словах увесь Маякоўскі, які заўсёды меў крытэрыем не колектыў, а сваё ўласнае „я“ нават тады, калі памнажаў людзей на мільёны». Нас зьдзіўляе, чаму „Зьвязда“, зьмяшчаючы ўчора вытрымку з артыкулу „Правды“, ня выправіла сваю памылку.

Мімаволі ўспамінаюцца словы самога Маякоўскага, сказаныя з другой прычыны:

Где ты
бронзы звон
или гранита грань?
А к решеткам
памяти
уже понавесили
стихов и воспоминаний
—дрянь“

Рэдакцыя „Рабочий“ далей піша, што Маякоўскі стварыў рэчы „значительной художественной и идейной ценности“ Якія-ж гэта могуць быць рэчы, калі аўтару іх „чуждо мироощущение пролетариата“?

Бяспрынцыповасьцю, поўнай адсутнасьцю клясавага крытэрыя, провінцыйнай крыклівасьцю—вось чым дыша артыкул „Рабочего“.

Мы добра ведаем, што марксыцкая крытыка, якая да гэтага часу амаль што зусім не працавала над колёсальным творчым матар'ялам Маякоўскага адшукае і прааналізуе элемэнты дробна-буржуазнага анархізму ў дарэволюцыйнай творчасьці поэты, установіць іх прычыны і характар, аб якіх гэтыя пісакі з „Рабочего“ маюць яшчэ мізэрнае ўяўленьне. Марксыцкая крытыка таксама прасочыць шлях поэты ў Кастрычнік і яго слаўны Кастрычніцкі шлях, які робіць яго поэтам рэволюцыі — інтэрнацыяналістым. Апошняе—самае важнае. Працоўныя масы ведаюць Маякоўскага іменна такім, і толькі з такога пункту погляду трэба ацэньваць яго творчасьць.

Ленін цаніў у Маякоўскім [...] тычны бок яго творчась[...] клясавую вастрату і злобадзён[...]

Рабочая кляса любіць М[...]скага, як барацьбіта і вогн[...] сьнеазака нашых дзён і тым [...] рашуча асуджае яго адыход з [...]ту рэвалюцыі.

Партыя і комсамол бач[...] асобе Маякоўскага „большого [ре]волюционного поэта, мастера [...]тельского цеха, неутомимого [ка]менщика социалистической ст[...] („Правда“).

І толькі газэта „Рабочий“ [...]ходзіць, што Маякоўскаму [...] мироощущение пролетариата“.

М. Гольдб[...]
А. Кал[...]

Як праводзіць прыкладны стат[ут] сельска-гаспадарчай арцелі

Растлумачэньне Наркамзему СССР і Колгасцэнт[ру]

Зацьверджана ЦВК і СНК Саюзу СС[Р]

1. Аб нормах здачы (продажу) загатоўчым органам збожжавай продукцыі (па п. 22 статуту).

Устанавіць для колгасаў у раёнах пераважна збожжавай гаспадаркі: (Паўночны Каўказ, Украіна, Ніжняя і Сярэдняя Волга, Башкірыя, Татарыя, Урал, Сібір, ЦЧО, Казакстан, Крым, вытворчыя збожжавыя раёны іншых вобласьцяй) норму здачы (продажу) таварнай збожжавай продукцыі загатоўчым органам ад аднэй чвэрткі да аднэй трэцяй часткі валавога збору, выходзячы з разьлікаў сярэдняга ўраджаю.

Для колгасаў нязбожжавых раёнаў устанавіць здачу (продаж) таварнага хлеба па норме, не перавышаючай аднэй восьмай часткі валавога збору зярна.

Уся астатняя маса валавога збору, як у збожжавых, так і ў нязбожжавых раёнах застаецца ў поўным распараджэньні колгасаў.

2. Аб азімых пасевах членаў с.-г. арцеляй (па п. 4 статуту).

Ураджай азімых культур, засеяных мінулай восеньню членамі с.-г. арцеляй у індывідуальным парадку, належыць пасеўшчыкам. Пры абмалоце азімых культур, засеяных у паказаным парадку, частка сабранага зярна прадаецца пасеўшчыкамі загатоўчым органам, згодна дагавораў аб контрактацыі, частка ідзе ў насенны фонд арцелі, а таксама на аплату колектыўнай уборкі і абмалоту, а ўсё астатняе зярно застаецца ў поўным распараджэньні пасеўшчыкаў, прычым, ніякі[х] гіх адлічэньняў у фонды кол[гасу] з азімых не ўтвараецца.

3. Аб аплаце працы ў сель[ска]-гаспадарчай арцелі (па [п. ...] статуту)

Аплата працы ў колгасах [робіц]ца выключна з выпікаў ураджаю і іншых даходаў колгасу.

Аплата працы робіцца і на[турай] і грашыма, прычым катэгор[ычна] забараняецца аплата працы [кол]гасьнікам унутры колгасу вы[ключна] грашыма.

У аснову разьлікаў з кол[гасьні]камі па лініі аплаты працы [кла]дзецца колькасьць і якасьць [працы] асобнага колгасьніка або згодна рашэньня агульнага [сходу] колгасьнікаў.

Прызнаць неабходным выл[учэнь]не з валавога ўраджаю с.-г. [арце]ляй і з іх прыбыткаў ад ма[лочнай] абагуленай жывёлы 5 проц. [для] разьмеркаваньня паміж кол[гасьні]камі, адпаведнай маёмасьці, [унесе]най кожным з іх у абагулен[ы] колгасу.

4. Аб уступных узносах [(па] п. 8 статуту)

Устанавіць разьмер уст[упных] узносаў для уступаючых у [колгас] 5 рублёў для батракоў і ад [...] 25 руб. для беднякоў і серад[някоў] у залежнасьці ад моцнасьці [гаспа]даркі уступаючага ў колгас.

Народны Камісар Зем[ля]робства СССР Я. ЯКА[ЎЛЕЎ]

Старшыня Колгасцэнт[ру] Т. ЮР[КІН]

Буда-кашалёўцы канчаюць раньні се[ў]

Адвод яравога кліну для колгасаў і індывідуальных [бед]няцка-серадняцкіх гаспадарак скончаны. Колгасы да пер[шых] лічбаў красавіка правялі пробны выезд у поле.

З 1-га красавіка па ўсіх колгасах распачата сяўба. А[соб]ныя колгасы ўжо канчаюць засеў траў і раньніх культур.

Колгас „Надзея“ засеяў каля 20 га розных культ[ур і] канчае сяўбу раньняга ячменю. Колгас „Трактарысты“ [так]сама канчае засеў траў яравых культур.

Але ў той час, калі ўсе колгасы раёну з вялікім эн[тузі]азмам праводзяць вясеньнюю сяўбу,—па індывідуальных [бед]няцка-серадняцкіх гаспадарках гэтай падрыхтоўкі няма. [...] яшчэ не падрыхтаваны к сяўбе, сельска-гаспадарчы інвэ[нтар] не здрамантаваны, насеньне не ачышчана.

Патрэбна прыняць тэрміновыя меры і ліквідаваць паг[розу] зрыву вясеньняй сяўбы па індывідуальных бядняцка-се[ра]дняцкіх гаспадарках.

КРО[...]

Комсамольскія ячэйкі ў баку ад соцбудаўніцтв[а]

Комсамольскія ячэйкі Лядзянскага раёну нездавальняюча ўдзельнічаюць у замацаваньні колгасаў і ў падрыхтоўцы іх да вясеньняй сяўбы.

На шэрагу колгасаў не абагулен цалкам сельска-гаспадарчы ін[вэнтар], не абагулена і не ачышчана [на]сеньне, колгасы ня маюць в[ытвор]чых працоўных плянаў і [...] праца ў колгасе не організава[на].

Комсамольскія ячэйкі, [...] практычнага ўдзелу ў вык[онаньні] конкрэтных мерапрыемстваў, [...] выносяць рэзолюцыі, не орга[нізуюць ...]чы для практычнага ўдзелу комсамольцаў і батрацка-бядн[яцкай] і серадняцкай моладзі колгас[аў].

Райком комсамолу ведае а[б] кім стане працы шэрагу ячэе[к], да гэтага часу ня прыняў [...] мер.

Васіль Рэв[...]

Барацьба за пролетарскія кадры--барацьба за пяцігодку

Узмацнім тэмпы і якасьць падрыхтоўкі кадраў. Кожны студэнт—барацьбіт за пяцігодку.

Стварыць неабходныя ўмовы для пасьпяховай працы навучальных устаноў

Шляхам разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі зьнішчым маючыяся недахопы ў падрыхтоўцы кадраў

Аб падрыхтоўцы кадраў у Б. Дз. У.

Неадкладна выправіць маючыяся прарывы

я гледзячы на пастановы ЦК пар- аб падрыхтоўцы кадраў—у БДзУ тым напрамку ня ўсё добра У час, калі краіна адчувае востры зіс у галіне кадраў, „па ўнівэрсы- ў гэтых адносінах адчуваецца кі „халадок". А калі ўзяць асоб- факультэты і курсы, дык гэтыя ны прымаюць зусім нецярпімы ха- тар.

а ўнівэрсытэце ўзяты курс за 100 д. наведваньне лекцый. Шляхам спаборніцтва, шляхам узмацненьня цыплiны ў гэтым кірунку дасягну- начныя посьпехі. Але адпаведныя іны прымушаючы студэнтаў аба- ова наведваць лекцыі, не клапо- ца аб вытворчым пляне, аб про- ыйнасьці працы, аб яе якасьці.

ру Пэдфак, 4-ты курс літаратур- і аддзяленьня. Людзі канчаюць вы- шую школу. Павінен быць ушчыль- час, мобілізавана энэргія, узяты ркі тэмп на заканчэньне програм, фармленьне ведаў, а на справе ыннае расьцягваньне часу занят- , недарэчнае разьмеркаваньне пра- Вось іх расклад: 1-га—выхадны ь, 2—дзьве гадзіны заняткаў, 3— е гадзіны заняткаў, 4—дзьве га- ы заняткаў,—5 выхадны, 6—вы- ы па „дэкрэту", 7—выхадны, 8— е гадзіны заняткаў, 9—дзьве га- ы заняткаў, 10—„спэцыяльны" вы- ы, 11—выхадны па „дэкрэту" і і г. д.

прача беспадстаўных прагулаў, іканых часткова і раскладамі, мож- агледзаць яшчэ і такія „прагулы", расклад запоўнены часам непа- нымі прадметамі, дзе няма сувязі ж тэорытычнай і практычнай пра- оўкай дысцыплін, дзе пануюць ускі і свавольнасьць асобных вы- чыкаў, дзе топчуцца на адным мецe ла два гады.

акты—ўпартая рэч. Трэці курс лі- турнага аддзяленьня, які павінен ь выпушчаны ўвосень, у сваей граме ня мае такой важнай дыс- іны, як дыялектычны матэрыялізм. інулым годзе быў прапрацаваны дзел аб „нравственности", а сёле- ічога ня было і ня мае быць. Вось і будуць новыя, чырвоныя літа- раведы, не вывучаючыя марксыс- дыялектыкі. Але затое, на гэтым е шмат гадзін адводзіцца на вы- ньне і дасьледваньне старажытнай насьці, накшталт пісьменьніка Ры- кага і г. д., затое у другі раз слу- ць курс гісторыі Расіі 19 веку: сь чытаў Пічэта, а сёлета Гесэн— нілася толькі назва, то была: „Гі- рыя Расіі", а зараз: „Гісторыя разь- ця грамадзкай думкі".

а другім курсе літаратурнага ад- еньня тое-ж самае: на марксыц- мэтадалёгію літаратуразнаўства о вызначана 24 гадзіны.

На гэтым-жа курсе пэдалёгічны практыкум зусім ня ўзгоднены з тэорытычнай прапрацоўкай матар'ялу і носіць, падчас, характар адцягнутасьці і непатрэбшчыны. Студэнты закіданы анкетамі на прадмет абсьледваньня дзіцяці, у якіх далёка не апошняе месца займаюць наступныя пытаньні: „Чым хварэла матка пры радох? На якім ложку дзіця спала, на драўляным ці жалезным?" і інш.

Другагоднiцтва ва ўнівэрсытэце займае значнае месца і па пэдфаку выяўляецца ў 17 проц., па мэдфаку—у 45 проц., па правгасе—22 проц. і рабфаку—2 проц. Бясспрэчна, што такі вялікі процант мажлівы толькі пры нерацыянальным скарыстаньні навучальнага году, пры частковай засьмечанасьці програм непатрэбшчынай, шматпрадметнасьцю і слабай дысцыплінай сярод студэнцтва.

Беларусізацыя—хворае месца

Беларусізацыя ў БДУ—хворае месца. Цэлы шэраг навуковых працаўнікоў не ўладаюць белмовай. З упэўненасьцю можна сказаць, што сярод 50 проц. студэнтаў пануе паўнейшая няпісьменнасьць.

У апошнім нумары „Кузьня Асьветы" у заметцы „Няпісьменныя студэнты" чытаем:

„Трэба прыняць меры ў адносінах да выкладчыка Ваўка-Леановіча, бо 7 месяцаў яго выкладаньня на першым курсе літаратурнага аддзяленьня прапалі ні за што! Увесь час на лекцыях вялася крытыка Лёсіка, школьнай граматыкі, працягваліся свае праэкты моўнага падзелу „разрады" „катэгорыі" —і звалася ўся гэтая неразьбярыха „філёзофіяй мовы". І толькі тады. калі паставілі рашуча пытаньне аб гэтым, выкладчык перайшоў на выкладаньне граматыкі. Лекцыі ня цікава праводзяцца—студэнты ўцякаюць. Уцякаюць і таму, што адным абрыдла, а другіх расхаладжвае тэорыя". „Няма чыстай мовы".

„Сходы і пасяджэньні беларусізаваны"

На дошках соцспаборніцтва ўсё ў парадку. „Толькі ў штодзённай гутарцы студэнты не ўжываюць на 100 пр. белмовы, а пасяджэньні і сходы поўнасьцю беларусізаваны".

Усяго толькі два курсы па пэдфаку прызналіся, што ў іх 20 проц. студэнтаў зусім ня ўжываюць белмову (першы соцыяльна-гістарычны і першы літаратурны).

Ёсьць яшчэ ў БДУ выкладчыкі, якія недаацэньваюць політычнага значэньня беларусізацыі. Напрыклад, дацэнт Саўсун. Першыя яго лекцыі шмат далі студэнтам, а пасьля пачалося таптаньне на месцы Калі зьявіўся аб гэтым допіс у „Кузьні Асьветы"—зьявіўся і Саўсун. Прачытаў і з ультыматумам заявіў: „Унижажаю!" Нарады, пасяджэньні, гутаркі і нарэшце абвяржэньне на допіс—„Саўсун праў".І тут ізноў усё пашло сваім чарадом.

Былі выпадкі, калі Саўсун проста сьмяяўся з белмовы, ганьбаваў літаратуру, зьневажаў беларускіх пісьменьнікаў.

„Почему вы думаете, что я не знаю белорусской литературы, почем вы знаете, что я не знаком с белорусскими писателями. я знаю—у вас есть какая-то ядуля, какая-то Янка Купала и целый ряд других".

Мы пытаемся ў Саўсуноў і ім падобных, ці ня ёсьць гэта праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму? — Нам здаецца, што гэта так.

Адпаведным органам патрэбна зьвярнуць належную ўвагу на важнейшае пытаньне—падрыхтоўку кадраў беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэтам.

Х.

Згубленае соцспаборніцтва

Гомельскі вячэрні рабфак існуе ўжо тры гады. Але за гэты час ён яшчэ ня выканаў тыя задачы, якія пастаўлены перад ім. У пачатку гэтага году рабфакам быў заключан дагавор па соцспаборніцтву з менскім вячэрнім рабфакам. Дагавор прадугледжваў цэлы шэраг конкрэтных пытаньняў. Заключала яго выканбюро ад імя студэнтаў. Студэнты-ж ня былі азнаёмлены з самым догаварам і прынялі яго бяз усякага абгаварэньня і належнай падрыхтоўкі. У хуткім часе дагавор быў згублены адным з членаў выканбюро і разам з ім было згублена соцыялістычнае спаборніцтва.

Справа з дысцыплінай пастаўлена вельмі дрэнна. Спазьненьні на лекцыі ператварыліся ў пэўную сыстэму. Акадэмічныя заняткі праходзяць дрэнна. Зусім не адчуваецца праца па ўкдрэньню беларусізацыі ў быт студэнтаў. Пры такіх умовах, калі соцспаборніцтва згубілася разам з дагаворам, пытаньне падрыхтаўкі рабочых кадраў не стаіць на належнай вышыні. Неабходна каму належыць заняцца гэтым пытаньнем.

Студэнт **Ю. Зэлікман.**

Курсы развальваюцца

Па пастанове ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ у Бабруйску неабходна было організаваць курсы па падрыхтоўцы рабочых, батракоў, комсамольцаў і партыйцаў у ВНУ. Курсы былі набраны. Пачалі працаваць, а ці скончаць і калі скончаць невядома. Па-першае, палове рабочых не далі разрахунку і не адпусьцілі з вытворчасьці, бо яны зьяўляюцца ўдарнікамі і кваліфікаванымі рабочымі, а дзеля гэтага па думцы гаспадарнікоў, яны не павінны ехаць вучыцца.

Такім чынам, ад набраных на курсы людзей, засталося палова. Застаўшаяся палова, якая складае 38 асоб, займаецца, але ім прапанавалі жыць пад адкрытым небам, бо на дварэ ўжо цёпла. Гарсавету і інспэктарыяту асьветы крыху цяжкавата паклапаціцца аб памяшканьні. Курсанты так і жывуць. Сёньня у Доме селяніна, заўтра ў доме асьветы, пасьлязаўтра ў акругкоме комсамолу на падлозе. Гэтак і „качуюць". Школу зьмясьцілі па самым канцы гораду, куды трэба высунуўшы язык бегчы добрых 50 хвілін. У школе няма загадчыка, не хапае настаўнікаў, няма падручнікаў, заняткі праходзяць не рэгулярна, курсы плывуць па волі хваль. Ня гледзячы на бегатню працаўнікоў акругкамолу, ні культпроп АК КП(б)Б, ні інспэктарыят асьветы не зварочваюць належнай увагі на гэтыя курсы, праяўляюць поўную пасыўнасьць і нежаданьне займацца імі. Паўстае пытаньне—ці абавязковы дырэктывы партыі для Бабруйскае акругі і кіраўнікоў грамадзкіх устаноў.

Курсант.



—Дзе сёньня начаваць будзем?
—Пазаўчора у гасьцініцы, учора у Доме Сэляніна, а сёньня мабыць у РСІ прыдзецца схадзіць.

11000 лекцый—на вецер

(*Гомель*, Б. *П. тэхнікум*)

У гомельскім белпэдтэхнікуме студэнтамі за першае паўгодзьдзе было прапушчана больш 11 тысяч лекцый і настаўнікамі больш 300. Гэта ненармальнае зьявішча, хоць большасьць прапушчана па ўважлівых прычынах, дрэнна адбіваецца на ходзе вучобы. Асноўная прычына гэтых ненаведваньняў зьяўляецца ў адсутнасьці неабходных умоў для вучобы. Інтэрнаты знаходзяцца не ў адным месцы, а за два з лішкам кілёмэтры ад тэхнікуму. Кожны дзень трэба астаўляць дзяжурных, а ў іншым выпадку нават і два, бо ўдзень бываюць выпадкі, калі ламаюць замкі і крадуць розныя рэчы. Дрэнна пастаўлена справа харчаваньня студэнтаў.

Гэтыя ўмовы перашкаджаюць пасьпяховаму ходу вучобы, што зьяўляецца пагрозай зрыву нашай працы, гэта ў той час, калі ёсьць належныя ўмовы, каб палепшыць жыцьцё студэнтаў.

Гомель. **Чарняўскі Язэп.**

Першыя вурокі сяўбы

паўднёвых раёнах СССР масавая сяўба знаходзіцца зараз у ным разгары. Раньнія коласавыя ўжо засеяны. Пачаты пасеў пашных культур і ўздым чорнага пароў. Аднак, такія важнейшыя сельска-гаспадарчыя раёны, Сярэдняя Волга, ЦЧО і інш. э толькі пачынаюць разгортваць пасеўныя работы.

ля гэтых раёнаў, а таксама цэлага шэрагу іншых, больш ночных, вялікае значэньне мае ыт масавай сяўбы на поўдні Р. Трэба ўлічыць усе памылкі бы, дапушчаныя пры правядзеньні пасеўных работ, выясьніць іх прычыны, каб не дапусьціць паўтарэньня іх у далейшым. кія-ж першыя вынікі бальшавіцкай сяўбы?

к паказвае вопыт Крыму, Паўночнага Каўказу і Украіны, соцыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі ў асноўным пасьпяхова ўляецца з задачамі сяўбы.

мат якія колгасы ня толькі нам выканалі свае пляны, але равыканалі іх. Савгасы таксама зусім пасьпяхова выконваюць вытворчыя заданьні і сваева перакідваюць сілы на дапамогу колгасам. Пасьпяхова спраўляюцца з вясеньнімімі работамі і МТС. Магутны энтузіязм і організаванасьць мас перамагаюць усе перашкоды і цяжкасьці.

Вось некалькі прыкладаў. Колгас „Новы Шлях" (Кубанская акруга Паўн. Каўк.) адным з першых у краі выканаў плян і прытым з перавышкаю на 21 проц. Колгас „Чырвоны Гігант" (Тэрск. акр.) закончыў сяўбу коласавых культур на тры дні раней, чым меркавалася ў пачатку і перавыканаў плян на 27 проц. Савгас „Гігант" засеяў 80.000 га ў 8 дзен і здолеў хутка перакінуць свае сілы і тэхнічныя сродкі на дапамогу колгасам.

Аднак, побач з буйнейшымі посьпехамі першага колгаснага севу мы маем у наяўнасьці цэлы шэраг сур'ёзьнейшых дэфэктаў. Надзвычайна слабая ўвага ўдзялялася сяўбе ў індывідуальных гаспадарках. У шмат якіх мясцох сярод індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак зусім не вялося ніякай работы па падрыхтоўцы к севу.

„Мы заняты колгасамі, калі-ж нам вазіцца з індывідуальнікамі", —так разважалі шмат якія з мясцовых работнікаў.

Вышаўшыя з колгасаў часта своечасова не атрымлівалі насеньня для пасеву. Ніякай агітацыйна-растлумачальнай работы аб ільготах індывідуальным гаспадаркам, якія пашыраюць пасеўную плошчу, узьнімаюць цаліну і ўводзяць некаторыя каштоўныя культуры (караньплоды, кармавыя травы),—у шмат якіх раёнах зусім не праводзілася. А між тым, ад посьпеху сяўбы ў індывідуальных гаспадарках яшчэ вельмі многае залежыць.

Неабходна неадкладна павесьці шырокую масавую работу сярод беднаты і серадняцтва з тым. каб выкрыць і паралізаваць кулацкую агітацыю за згортваньне пасеўных плошчаў і сабатаж важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў.

Другім буйнейшым недахопам ў правядзеньні сяўбы зьяўляецца слабая організацыя працы у многіх колгасах. Часта бываюць выпадкі, калі ў колгасах зусім не распрацаваны ўмовы і нормы аплаты працы. Колгасьнікі ня ведаюць, як будзе ўлічвацца іх работа і колькі яны за яе атрымаюць.

Усё гэта стварае ненармальнае становішча, часта паслабляе ў колгасьнікаў працоўны ўздым і імкненьне да работы.

Часта ў самы рашучы момант палявых работ утвараліся вытворчыя непаладкі: не хапала запасных трактарных частак, прычэпных прылад, конных рэзэрваў. Часта ня было загадзя дакладна разьлічана, якая колькасьць рабочай сілы, жывога і мёртвага інвэнтара неабходна для выкананьня данага вытворчага заданьня, у выніку чаго ўзьнікалі ўсялякія заторы. Вельмі часта былі непаладкі ў кіраўніцтве. Нярэдка адсутнічала неабходная ўзгодненасьць дзеяньня і сувязі між брыгадзірамі, кіраўнікамі вучасткаў, праўленьнем колгасу і г. д.

Акрамя гэтага, у многіх колгасах выкрыліся такія важнейшыя прабелы, як дрэнная якасьць рамонту машын і прылад, моцны недахоп кармоў для рабочай жывёлы, слабая дысцыплінаванасьць колгасьнікаў. Характэрным зьяўляецца амаль паўсюднае перавыдаткаваньне гаручага, утварыўшае рэальную пагрозу недахвату яго да скančэньня работ.

Паўсюды адзначаецца надзвычайна слабое абслугоўваньне колгасьнікаў неабходнымі продуктамі ў часе палявых работ. Гарачае харчаваньне на полі ў большасьці колгасаў не організавана. Спажывецкая коопэрацыя не змагла прыстасаваць сваю работу да запатрабаваньняў пасеўкампаніі.

Уступаючыя ў сеў раёны павінны ўлічыць усе гэтыя непаладкі і загадзя прыняць меры да іх выжыцьця.

Сяўба зьявілася баявой праверкай і для колгасных і савгасных комсамольскіх ячэек. Гэта баявая праверка паказала, што многія комсамольскія ячэйкі яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

Аднак, мы маем і агромністы дадатны вопыт.

Так, комсамольцы савгасу „Гігант" змаглі пераключыць усю сваю работу на ўдарныя рэйкі. Яны організавалі комсамольскія ўдарныя брыгады, даўшыя высокія паказальнікі па якасьці работы і па вытворчасьці працы. Зараз тры ўдарныя маладзёжныя брыгады „Гіганту" працуюць на колгасных палёх, заражаючы ўсіх сваёй энэргіяй і баявым энтузіязмам. Комсамольцы вопытна-паказальнага савгасу зернатрэсту організавалі спэцыяльныя комсамольскія вучасткі і даволі пасьпяхова спраўляюцца з работай.

Губашэўскія і Тамілоўскія комсамольцы яшчэ да сяўбы разьбіліся на брыгады. з якіх кожная паставіла сабе адну пэўную задачу. Гэтыя брыгады ахапілі ўсе галоўныя бакі вытворчай работы і ўнесьлі ажыўляючы струмень ў работу па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Тамілоўскія і Губашэўскія комсамольцы першымі ўступілі ва ўсесаюзную пераклічку комсамолу па організацыі працы, праводзімую „Комсомольской Правдой".

Вопыт лепшых трэба зрабіць агульным здабыткам, шырока папулярызуючы яго па ўсім СССР.

Н. В.

Вялікі замежны паход лінкора «Парыская Комуна» і крэйсэра „Профінтэрн“

Караблі ў Брэсьце

(Ад нашага спэцкора)

І дарма буржуі баяліся. Мы не агітавалі рабочых, але яны бачылі, як жывецца нашаму чырвонафлётцу і яго ўзаемаадносіны з камандзірамі. Бачылі нашы вечары самадзейнасьці, пераконваючыся наколькі культурна мы праводзім свой адпачынак, не хвалюючыся з-за таго, што нас ня пусьцілі на бераг. Яны з захапленьнем гаварылі аб Марці, запэўніваючы, што вырвуць яго з турмы. З вялікім энтузіязмам працавалі на караблі, які носіць дарагое ім імя Парыскай Комуны. Тайком перадавалі прыбіральнікам нашых кацераў нумары газэты „Юманітэ“. Матросы даравалі на ўспамін нашым чырвонафлётцам свае шапкі. Каманднаму складу і частцы чырвонафлётцаў было дазволена сходзіць на бераг толькі па службовых справах.

Пра гэтыя групкі буржуазная газэтка „Ля Дэпеш“ прымушана была пісаць наступнае: „Афіцыйнага дазволу аб сходзе на бераг здаецца ня было дадзена, але была зроблена ўступка. Савецкая каманда вядзе сябе вельмі добра“ (?) Мы добра разумеем, якіх цяжкасьцяй каштавала напісаць гэта—„вельмі добра“.

Але факты—рэч упартая, супроць іх ня пойдзеш. Вялі сябе прыкладна і не напісаць аб гэтым быў-бы проста сорам.

Тых нямногіх, якія пабывалі на беразе, як заўсёды абкружвалі расійскія эмігранты, якія ў адзін голас надкрэсьлівалі, што яны выехалі з Расіі „да рэволюцыі“, каб прыкрыць свае ўцекі ад яе. Іх пытаньні трафарэтныя: ці праўда, што ў вас страляюць, б'юць жанчын, што ў вас голад... І цяжка пераканаць іх у выдумцы гэтага. А не знайшоўшы супярэчнасьцяй, яны плачуць. Што гэта,—сьлёзы злосьці, ці каяньня.

Некалькі слоў аб жыцьці францускіх рабочых. Францускія социялістыя запэўніваюць, што рабочая кляса Францыі пражывае ў матар'яльным і моральным дабрабыце. Ад гутарак з многімі рабочымі ў нас склалася зусім іншая думка. Бюджэт рабочага нікчэмны, большая частка яго ідзе на продукты першай неабходнасьці, цэны на якія вельмі высокія, тагды як узровень цэн на прадметы раскошы—вельмі нізкі. Напрыклад: чатыры кілё мяса каштуюць стольк-ж, колькі лякіраваныя боцікі; хромавыя-ж, неабходныя кожнаму рабочаму, каштуюць ужо даражэй. Вітрына любога магазыну служыла довадам гэтага. Становіцца зразумелым, чаму гэта ўсе францускія рабочыя замест боцінак носяць на нагах цяжкія дзеравяныя калодкі. Або, магчыма, законадаўца мод—Парыж прыдумаў асобную моду для францускага пролетарыяту?

Правакатары таксама мелі гонар нас наведаць. За час нашай стаянкі ў Брэсьце да барта некалькі раз падыходзілі шлюпкі з падазронымі тыпамі, якія, імянуючы сябе „комуністамі“, надзвычайна адкрыта вамахваючы партыйнымі білетамі, прасілі паклікаць ім камісара, адначасова распытваючы аб даных карабля і аб нашай думцы —ці хутка будзе паўстаньне францускіх матросаў. Пасьля таго, як дзьве—тры такія групы мы проста папрасілі адыйсьці ад карабля, яны спынілі свае наведваньні.

Стаянка ў Брэсьце была скарыстана намі максымальна. Уласнымі сіламі зрабілі неабходны рамонт

У гонар месячнага прабываньня ў плаваньні быў дадзен вечар спайкі камскладу з чырвонафлётцамі ў кают-кампаніі лінкора, які адначасова служыў адказным вечарам на вечары, наладжаныя чырвонафлётцамі з запрашэньнем камскладу. Мы скарысталі іх для таго, каб падзяліцца вопытам пройдзенага шляху. Дакладвалі аб багатоўнасьці мэханізмаў для далейшага пераходу. Затым быў наладжан вечар самадзейнасьці. Тут к месцу будзе прывесьці вытрымку з размовы журналістага П'ера Буа у камандзіра нашага атраду: „Ноч спусьцілася на рэйд,—піша ён,—на караблях сьцягі спушчаны, што зусім зьнішчыла розьніцу паміж намі. Тойжа ценярыс вартавога на абодвух бакох. Аднольковая электрычнасьць абкружае карпусы французаў і лінкора флёту СССР. Трэба ісьці далей, каб убачыць розьніцу“. Так, мусье, іменна далей, нават яшчэ далей, чым гэта вам уяўляецца трэба пайсьці вось на такі банкет, у нутро савецкага карабля. Там вы ўбачыце, як камандзір і чырвонафлёцец разам абгаварваюць свае дзеяньні, дзеляцца вопы там і ўражаньнямі, а потым пайсьці на францускі карабель для таго, каб убачыць сцэнку, якую з нашага карабля можна было добра наглядаць, як на палубе лінкора „Дзідро“, унтэр-афіцэр лупіў па мордзе францускага матроса.

Было за што і пахваліць французаў.

Морскі прэфэкт уважліва ішоў на спатканьне нашым караблям. Усё, што патрабавалася, дастаўлялася акуратна. Перад нашым уходам адзін наш чырвонафлётец захварэў вострым апэндыцытам. Ён быў зараз-жа прыняты ў шпіталь, і, ня гледзячы на першы дзень калядаў, тэрмінова і ўдала опэраваны і пакінуты на лячэньне ў Францыі.

Некаторы казус атрымаўся з рамонтам. Спачатку ваенны порт адмаўляўся ад работ, быццам з-за „перагрузкі работамі“. На справе-ж яны баяліся „агітацыі“ рабочых з боку савецкіх маракоў. А мы на 99 проц. ня ведаем францускае мовы (на наш вялікі жаль). Толькі пасьля таго, як наша камандаваньне зьвярнула ўвагу ваенна-марское ўлады Брэсту, што сьмешна ня даць нам 10-15 чалавек рабочых на тыдзень, у той час, як у порце будуецца некалькі ваенных караблёў для Грэцыі, Польшчы і іншых, і што камандаваньне лічыць нежаданьне аказаць нам садзейнічаньне прынцыповым, морская ўлада Брэсту адабрала работы ў прыватніка, заламаўшага ў нас вялікія грошы і працягнуўшага тэрмін, узяліся за рамонт, які быў скончаны з дакладнасьцю да хвіліны.


Напярэдадні нашага выхаду з Брэсту на карабель прыбылі прадстаўнікі паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Парыжы. Асабовы склад караблёў заслухаў іх прывітаньні і даклады. Таварышы з паўнамоцнага прадстаўніцтва прывезьлі караблям падарункі: па грамафону, які ня мала нам дапамог у далейшым плаваньні ў вольныя хвіліны, і па фото-апарату для карабельных фото-гурткоў. За гэты пераход было выпушчана 11 фотогазэт.

Нарэшце ўсе прыёмкі і работы былі скончаны і мы вышлі з гавані на рэйд. Камандзір карабля адмовіўся ад дапамогі, якую прапанавалі буксіры і сам, без пабочнай дапамогі, вывеў лінкор з гавані. А вывесьці дрэдноут з незнаёмай гавані сваімі машынамі сярод маракоў лічыцца асаблівым морскім шыкам.

У першы дзень каляд, стоячы на рэйдзе, адпрацоўвалі дзень індустрыялізацыі. Камандны склад адлічыў аднадзённы заработак. А ў гэты час у некалькіх кабэльтавых ад нас каталіцкія пастары сьвяткавалі каляды, стрыглі сваю паству. У нас на караблёх заканчваліся апошнія падрыхтаваньні да пераходу Брэст-Кальяры-Нэаполь. Увечары разгарнула работу ячэйка ваяўнічых бязбожнікаў. Па караблі ішлі анты-рэлігійныя лекцыі і гутаркі.

26-га сьнежня, падняўшы „дзякуем за добры прыём“ (у простым і пераносным сэнсе), мы пакінулі Брэст.

М. ФАЛІН.



Лінкор „Парыская Комуна“ на зімовай стаянцы ў Сэвастопалі

Да праверкі ведаў студэнтаў завочнага рабфаку

Менскі Завочны Рабфак цалкам выканаў праграму 1-га курсу рабфаку.

У сувязі з тым, што некаторыя студэнты не пасьпелі прапрацаваць усіх 7-мі заданьняў Завочнага Рабфаку, дзякуючы розным перашкодам, якія сустракаліся ў студэнтаў як на вёсцы, так і ў горадзе, дэканат Рабфаку ўстанаўлівае для праверкі ведаў 2 тэрміны: першы тэрмін з 20 па 25 мая г. г., другі тэрмін з 1 па 5 жніўня г. г.

У маі месяцы будуць выклікацца толькі тыя таварышы для праверкі ведаў, якія цалкам прапрацавалі 7 заданьняў. У гэты час будуць таксама выкліканы студэнты якія наогул адсталі ў акадэмічных адносінах, якім неабходна дапамога Рабфаку ў сэнсе самастойнай прапрацоўкі заданьняў. а такіх на вялікі жаль ёсьць шмат.

Усім студэнтам якія будуць выкліканы ў гор. Менск, будуць пасланы літары з 50 проц. скідкай на праезд па чыгунцы, але батрацкай, бядняцкай частцы студэнцтва, а таксама і колгасьнікам будзе дана дапамога на праезд назад па чыгунцы.

Студэнтам, якія знаходзяцца ў адлегласьці 100 кілёмэтраў ад Менску, літары пасылацца ня будуць і яны павінны будуць прыехаць на свой кошт.

У часе праверкі ведаў студэнтам будзе прадстаўлена агульнае памяшканьне, харчаваньне-ж павінна набывацца за свой кошт.

Разам з праверкамі ведаў першага курсу будуць таксама прымацца асобы на другі курс завочнага Рабфаку па праграме першага курсу, для чаго патрэбна сваечасова падаць аб гэтым заяву і прыкласьці ўсе дакумэнты згодна правілаў прыему на Завочны Рабфак (гл. „Савецкая Беларусь“ за № 82 (2870) ад 8 красавіка г.г.).

Студэнты колгасьнікі, а таксама працуючыя на вытворчасьці павінны падаць заяву аб водпуску іх у гор. Менск на час праверкі ведаў.

УСІМ ЯЧЭЙКАМ ЛКСМБ

Мен. АК ЛКСМБ АДЧЫНЯЕ ў гэтым годзе

ДОМ АДПАЧЫНКУ

які будзе існаваць з 15-5 па 15-8.

Усе эканом-працаўнікі павінны прынесьці ў АК ЛКСМБ сьпісы т. т., жадаючыя ехаць у дом адпачынку, з 15-га красавіка па 1-е мая. Сьпісы будуць прымацца 3 разы ў тыдзень: па нядзелях, серадах і пятніцах ад 6-ці да 8-мі гадзін увечары.

Заг. Мас. Эканом Аддз. АК ЛКСМБ ГОЛЬДБЕРГ.

Помнік Ільлічу



Проэкт помніка Уладзімеру Ільлічу, які робіцца скульптарам Гру... сельска-гаспадарчай выстаўка. Па праэкту помнік будзе пабудаван ... чынам: трыбуны, леса пабудовы. Помнік будзе стаяць на элеватары, будаўнічая вышка вышынёю ў 21 мэтр. Фігура будзе вышынёй у 7 ... Ўвесь помнік па праэкту павінен займаць плошчу ў 160 квадр. мэтраў ... рама фігуры будзе пабудаваны толькі з дрэва.

На здымку:—Скульптар Грубэ за працай над проэктам.

Завочны інстытут журналістыкі

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што 1-га мая адчыняецца пры ГІЖ завочны інстытут журналістыкі.

Мэта завочнага ГІЖ—павысіць тэорэтычны і політычны ўзровень і вытворчую (газэтную) кваліфікацыю членаў партыі і комсамольцаў, якія працуюць, як у нізавым (фабрычна-заводзкіх, савгасных і колгасных друкаваных газэтах), так і ў агульным друку.

Завочны ГІЖ мае два аддзяленьні: першае—для работнікаў нізавога друку (фабрычна заводзкіх, колгасных і савгасных друкаваных газэт) і другое—для работнікаў агульнага партыйна-савецкага пэрыодычнага друку.

I. На першае аддзяленьне прымаюцца

1. Члены і кандыдаты УсеКП(б) і члены УсеЛКСМ з комсамольскім стажам ня менш 3-х год, якія зьяўляюцца рэдактарамі і членамі рэдколегій друкаваных фабрычна-заводзкіх, колгасных і савгасных газэт.

ЗАЎВАГА. У парадку выключэньня дапускаецца прыём беспартыйных членаў рэдколегій фабычна-заводзкіх, колгасных і савгасных газэт з вытворчым стажам ня менш 5 год, актыўных грамадзкіх працаўнікоў, пры наяўнасьці командыроўкі партыйнага камітэту.

2. Кожны з паступаючых на гэтае аддзяленьне павінен умець бегла пісаць, выказваць свабодна ў пісьмовай форме свае думкі, ведаць 4 дзеяньні арытмэтыкі.

3. Тэрмін навучаньня 2 гады (20 вучэбных месяцаў).

4. Прыём утвараецца толькі на ўвесь курс. Запіс на асобныя прадметы не дапускаецца.

5. Пры адпаведных мясцовых кіруючых газэтах для завочнікаў склікаюцца штогодна курсы-конфэрэнцыі.

Скончыўшыя завочны курс першага аддзяленьня карыстаюцца пераважным правам паступленьня ў Дзяржаўны Інстытут Журналістыкі пры здавальненьні іх асноўным правілам прыёму (партыйны і вытворчы стаж).

II. На другое аддзяленьне прымаюцца

1. Асобы, якія працуюць у агульным пэрыодычным друку (газэты) члены і кандыдаты Усе... члены УсеЛКСМ з комсам... стажам ня менш 3-х год. ... шую чаргу залічваюцца ... якія прышлі ў друк непаср... вытворчасьці.

2. Кожны паступаючы ... аддзяленьне павінен мець ... тоўку ў аб'ёме ня ніжэй ... школы другой ступені.

3. Тэрмін навучаньня на ... аддзяленьні—3 гады (30 ву... месяцаў).

4. Прыём робіцца як на ... курс, так і на часьць яго. ... ковымі зьяўляюцца ўсе спэ... ныя (газэтныя) і экономічны... меты. Астатнія прадметы ... леньня праходзяцца па ... завочніка.

5. Для завочнікаў друго... дзяленьня будуць штогодн... кацца ў адпаведных к... рэспубліканскіх і абласны... трах курсы-конфэрэнцыі.

III. Агульныя ўмо...

1. Прыём на завочны ГІЖ ... ваецца, як правіла, па к... роўках партыйных камітэт...

2. Абучэньне на завочны... для камандыраваных парт... камітэтамі бясплатнае. З... выпісваюць толькі за ... плату (ня вышэй 10 рублёў ... друкаваныя заданьні і лек...

3. Асобы, якія адпавядаю... вышэйадзначаным патрабав... але не папалі ў разьвёрст... гуць быць залічаны за пл... вышэй 30 руб. у год).

4. На пачатках платнась... скаецца прыём і беспар... якія прышлі ў друк у пар... лучэньня з вытворчасьці, п... ве рэкомэндацыі іх мясцов... ячэйкай.

Гэтыя катэгорыі на ... конфэрэнцыі не выклікаю...

5. Вучэбныя пляны за... ГІЖ разьлічаны на што... самастойную працу завоч... менш паўтара гадзін у дз...

ЦК КП(б)Б прадстаўлена ... —жадаючыя паступіць пав... даць заяву і анкету ў Ку... ЦК не пазьней 25-4-30 году.

Адказны рэдакт...

Рэдколе...

Сёньня 17-4 30 г., а 6 гадзіне ўвечары ў памяшка... РК адбудзецца пасяджэньне Фрунзэўскага РК ЛКСМБ. Да бюро ... вінны падрыхтаваць інфармацыі аб ходзе і падрыхтоўцы да ... віны соцспаборніцтва наступныя колектывы: Комунар, 1-ай ... карні, Акцябр, завод ДО і Белдзяржбуд.

Дом пісьменьніка (Савецкая, 6...)

Сёньня 17-га красавіка

жалобны веча...

памяці вялікага рэволюцыйнага поэты

УЛАДЗІМЕРА МАЯКОЎСКАГ...

Запрашаем ушанаваць памяць поэты рабочых, пісьме... нікаў, мастакоў, композытараў, артыстых.

Пачатак а 7-й гадзіне ўвечары.

Праўленьне Дому Пісьменьніка

Менск, друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59...